Источник: "Настаўніцкая газета" - 2021-12-07

# "Як зараз памятаю..."



У гэтым годзе споўнілася 40 гадоў працы ў сярэдняй школе № 2 Асіповіч выдатнага педагога **Неанілы Львоўны Цыганок.** За спінай настаўніцы — тысячы ўрокаў, падрыхтаваных вучняў, пераможцаў алімпіяд і навуковых конкурсаў. Пашчасціла і аўтару наступнага пісьма быць вучаніцай Неанілы Львоўны.

"Як зараз памятаю, настаўніца заходзіць у клас — і ўсе вучні накіроўваюцца ў цікавае падарожжа па старонках гісторыі, — успамінае выпускніца сярэдняй школы № 2 Асіповіч, навуковы супрацоўнік Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, член праўлення пярвічнай арганізацыі БСЖ НАН Беларусі *Алеся Салавей*. — Калі да нас прыйшла Неаніла Львоўна, мы вучыліся ў 7 класе, у кожнага ўжо было сваё ўспрыманне прадмета. Сустрэлі новага настаўніка насцярожана, бо Неаніла Львоўна нам здавалася строгай настаўніцай, яна хацела, каб яе прадмет ведалі. Нашы асцярогі не былі марныя. Настаўніца змяніла патрабаванні да адказаў вучняў, форму выкладання, манеру зносін і многае іншае. Нашы адзнакі крыху знізіліся. Але прайшло літаральна некалькі месяцаў, і сітуацыя змянілася. Памятаю, як пайшла на першую ў раёне алімпіяду па гісторыі і нават не чакала, што стану пераможцай. Гэта прымусіла мяне паверыць у свае сілы".

Для найлепшага засваення праграмнага матэрыялу педагог з вучнямі часта ездзілі ў тэатры, наведвалі музеі і выставы, сустракаліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, глядзелі гістарычныя дакументальныя і мастацкія фільмы, чыталі кнігі.

"Мы ведалі, што настаўніца займаецца вывучэннем гісторыі Халакосту, — працягвае Алеся Салавей. — Адна з вучаніц у сябе ў вёсцы адшукала жанчыну, бацька якой быў Праведнікам народаў свету, але пра гэта ніхто ў раёне не ведаў. Неаніла Львоўна з'ездзіла да гэтай жанчыны, запісала яе ўспаміны. Пабывала ля дома, дзе герой разам з жонкай і маленькай дачкой ратаваў сям'ю яўрэяў ад расстрэлу, напісала аб гэтым у сваёй кнізе "Вайна вядомая… і невядомая". Яе ўразіла закінутая магіла героя. Наша настаўніца з дапамогай іншых неабыякавых людзей спрыяла таму, што зараз на магіле К.Раковіча стаіць новы помнік. І такіх гісторый я магу прывесці шмат".

На ўроках Н.Л.Цыганок дзеці не проста пераказвалі параграфы падручніка, а вучыліся аналізаваць, дыскутаваць, разважаць, выказваць свой пункт гледжання, асвойвалі метады параўнання і сістэматызацыі інфармацыі. Па словах аўтара пісьма, менавіта дзякуючы любімай настаўніцы, цяперашні навуковы супрацоўнік Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі вучылася быць упэўненай у сабе, сваіх здольнасцях і магчымасцях, зрабіла правільны прафесійны выбар. Аднакласніца Алесі Салавей стала настаўніцай гісторыі, яшчэ адна былая вучаніца Неанілы Львоўны — кандыдатам гістарычных навук. Многія яе вучні скончылі ці вучацца зараз на гістарычным факультэце БДУ, выпускніцай якога з'яўляецца і іх любімая настаўніца.

"Прайшло ўжо больш за 10 гадоў з моманту заканчэння школы, і ўвесь гэты час мы сябруем і падтрымліваем з настаўніцай цёплыя адносіны, — піша аўтар. — Да Неанілы Львоўны заўсёды можна звярнуцца па параду, яна заўсёды дапаможа і падкажа".

Наталля Кастэнка. "Як зараз памятаю..."